УДК [398.54:793.22](476.7)

***І. В. Хамутова,***
*аспірант кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», педагог дадатковай адукацыі «Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Ветразь”», г. Мінск, Беларусь*

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ СЕМАНТЫЧНЫХ КОДАЎ КАЛЯДНАЙ АБРАДНАСЦІ

**Анатацыя.** Разглядаецца сакралізацыя паўсядзённага жыцця і абрадавых дзей. Лічыцца, што рэальны і сакральны свет на Каляды аб’ядноўваліся, таму абрадавыя дзеі ладзіліся не для гульні ці забавы, а з мэтай павароту сонца на лета і пераадольвання хаосу і пабудовы гармоніі з навакольным светам. На трансфармацыю міфалагічнай свядомасці мясцовых жыхароў і, адпаведна, семантычных кодаў заходнепалескай каляднай абраднасці аказаў значны ўплыў пераход ад язычніцтва да хрысціянства. У ХХ ст. абрадавыя дзеі моцна трансфармаваліся пад уздзеяннем масавай культуры і непасрэдна глабалізацыі.

**Ключавыя словы:** трансфармацыя, семантыка, калядная абраднасць, шчадраванне, аг. Хацíслаў, Давыд-Гарадок, глабалізацыя.

***I. Khomoutova,***
*Postgraduate student of the Department of Folksong Art and Folklore of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts", teacher of additional education of the "Minsk Centre for Supplementary Education for Children and Youth «Vetraz»", Minsk, Belarus*

# TRANSFORMATION OF SEMANTIC CODES OF CAROLING RITUALISM

**Abstract.** In the past, the sacralization was observed in everyday life, and over time it also passed into ceremonial activities. The caroling time in the minds of local residents is unusual. It is believed that the real and sacred world united on Kolyady together. Ceremonial activities were organized not for play or fun, but with the purpose of turning the sun for the summer and overcoming chaos and building harmony with the world around in unholy time. One of the first significant influences on the transformation of the mythological consciousness of local residents and, accordingly, the semantic codes of the West Polesie caroling ritualism is the transition from paganism to Christianity. In the 20th century ceremonial acts were strongly transformed by mass culture and directly globalization.

**Keywords:** transformation, semantic, caroling ritualism, caroling, agrotown Hotislav, Davyd-Gorodok, globalization.

Французскі этнограф і фалькларыст А. ван Генеп пісаў: «Звяртаючыся да ранніх стадый развіцця цывілізацыі (гэтае паняцце мы ўжываем у самым шырокім сэнсе), мы назіраем усё большую перавагу сакральнага над свецкім; сакральнае ў слабаразвітых грамадствах ахоплівае амаль усе этапы жыцця» [2, с. 8]. З цягам часу сакралізацыя з паўсядзённага жыцця перайшла ў большай ступені ў абрадавыя дзеі. Адным са свят, якое яскрава выдзяляецца з штодзённага жыцця, з'яўляюцца Каляды. Украінская даследчыца семантыкі калядак Ю. А. Стаянава адзначае: «Каляда як сінонім Раства – гэта асноўнае гадавое свята, якое азначае пераход ад старога года да новага, – яно "аднаўляе сваёй структурай тую прымежную крызісную сітуацыю, калі з хаосу ўзнікае космас"» [7, с. 74].

Нягледзячы на сакральнасць святкавання Каляд, з цягам часу адбываецца трансфармацыя іх семантычных кодаў. Гэтаму паспрыяў пераход ад язычніцтва да хрысціянства. Украінская даследчыца Н. Кавальчук адзначае, што славянская культура знаходзіцца на стыку дзвюх рэлігійных сістэм – язычніцкай і хрысціянскай [4, с. 105]. Адлюстраванне гэтаму знаходзіцца ў калядна абраднасці Заходняга Палесся.

У заходнепалескім аг. Хаціслаў і зараз у межах аднаго Шчадравання бытуе спалучэнне традыцый язычніцкага і хрысціянскага паходжанняў. Гурт калядоўшчыкаў увечары 13 студзеня бярэ калядную зорку, а аднаго з калядніакаў абавязкова пераапранаюць у казу. Падчас абыходу двароў гучаць калядкі як язычніцкага паходжання: «Господарыку, выйды но на двир» [9, с. 145], «А в саду-саду мак розцвытае» [Там же, с. 146], «Пуд окном чорна хмара вьеця» [Там же, с. 147], «На гори вовчок з вовчэнятамы» [Там же, с. 147–148], «Роды, Божэ, жыто» [Там же, с. 149], так і хрысціянскага: «Добрый вэчур тоби, панэ господарю!» [Там же, с. 146], «Нова радасць стала» [Там же, с. 150]. Апошняя знайшла навуковае асэнсаванне ў артыкуле «Еволюція народної релігійної колядки в новітній час» В. Задарожнага, дзе ён адзначае, што велічальна-віншавальны матыў у некаторых песнях паступова трансфармуецца ў прашальна-віншавальны, што, напрыклад, асабліва яскрава праяўляецца ў калядцы «Настала радасць новая» [3, с. 72].

На трансфармацыю семантычных кодаў каляднай абраднасці моцна ўздзейнічала глабалізацыя. Жыхары заходнепалескіх вёсак атрымалі магчымасць праз сродкі масавай інфармацыі, такія як тэлебачанне, а пазней і глабальную сетку Інтэрнэт, далучыцца да масавай культуры і прымаць новыя ідэалы.

Дадзены ўплыў вельмі відавочны ў сучасным стане традыцыі Шчадравання «Конікі» (Давыд-Гарадок, Столінскі раён, Брэсцкая вобласць, Заходняе Палессе [10, р. 217]. У дадзенай мясцовасці гурт калядоўшчыкаў традыцыйна складаўся з пераапранутых у Коніка, Дзеда, Бабу, Казу ці Казла, Чорта, Барана, Мядзведзя, Бусла, Смерць і Скарбніка [8, с. 336]. Кожны з персанажаў быў не выпадковы, а нёс у сабе глыбокія семантычныя коды. Разгледзім некаторыя з іх.

Так, мядзведзь з'яўляецца татэмнай жывёлай беларусаў і да яго ставіліся з вялікай павагай, а маскі Дзеда і Бабы, па словах мясцовых жыхароў, сімвалізавалі для гарадчукоў продкаў [1]. Даволі распаўсюджана, калі ў Бабу апранаецца мужчына, а ў Дзеда – жанчына, што з'яўлялася магічным актам пераадольвання хаосу праз гульню і смехавы канон. Такім чынам, мясцовыя жыхары ў калядны час падпарадкоўваліся хаосу, калі, адпаведна міфалагічнай свядомасці, «гэты» (рэальны) і «той» (сакральны) свет аб'ядноўваліся, каб пераадолець хаос у мірны час.

Вобраз Каня сімвалізуе мужчынскую моц, што і зараз застаецца ў свядомасці гарадчукоў, аб чым сведчыць той факт, што ў Каня пераапранаюць заўсёды аднаго з самых моцных хлопцаў альбо мужчын. Важна адзначыць, што ў Давыд-Гарадку некаторыя функцыі і семантычныя коды каляднай Казы былі перакладзены на Каня. Так, сустракаецца элемент Шчадравання, калі Конік сядае на дарозе і не рухаецца далей, пакуль Скарбнік яго не пачастуе калядой.

Зараз у Давыд-Гарадку падчас Шчадравання сустракаюцца наступныя персанажы: Воўк [5, с. 26], Снегавік, «Дзед Мароз, Снягурачка, Павук, Мухамор, Дыназаўр, Чэбурашка, Панда, Кот, Гусар, Кракадзіл, Слон, Сабака, Елка, Пірат, Вадзянік, Клоўн, Баба Яга і інш.» [8, с. 336], якія не нясуць сакральныя сэнсы, а абіраюцца ўдзельнікамі шчадравання, каб зрабіць для сябе яскравы і непаўторны вобраз. Яшчэ ў 60-х гадах мінулага стагоддзя З. Я. Мажэйка ў сваім артыкуле адзначыла, што ў побыце сучаснай палескай вёскі Каляда – любімая зімовая

гульня, свайго роду карнавал, які ў аднолькавай ступені захоплівае моладзь і людзей сталага ўзросту [6, с. 127]. Дадзенае меркаванне актуальна і ў дачыненні да давыд-гарадоцкіх «Конікаў» (мал.), якія існуюць і зараз.



*Мал.* Традыцыя шчадравання «Конікі», Давыд-Гарадок, 2016 г.
Фота Г. Гашук

Такім чынам, асноўнымі фактарамі ўплыву на трансфармацыю семантычных кодаў каляднай абраднасці з'яўляюцца наступныя: пераход ад язычніцтва да хрысціянства, уздзеянне глабалізацыі і, як вынік, даступнасць масавай культуры праз сродкі масавай інфармацыі.


*1.* Абрад «Конікі» (г. Давыд-Гарадок, Столінскі р-н, Брэсцкая вобл.) [Электронны рэсурс] // Жывая спадчына Беларусі : інвентар нематэр. культур. спадчыны. – Рэжым доступу: https://livingheritage.by/events/694/. – Дата доступу: 23.06.2022.

*2. Геннеп, А. ван.* Обряды перехода: систематическое изучение обрядов / А. ван Геннеп ; пер. с фр. Ю. В. Ивановой, Л. В. Покровской. – М. : Вост. лит. Рос. акад наук, 1999. – 198 с.

*3. Задорожний, В.* Еволюція народної релігійної колядки в новітній час / В. Задорожний // Нар. творчість та етнографія. – 2004. – № 1/2. – С. 69–75.

*4. Ковальчук, Н.* Трансформація християнських уявлень у традиційній календарній обрядовості поліщуків (історико-етнографічний аспект проблеми на прикладі Волинського Полісся) / Н. Ковальчук // Нар. творчість та етнографія. – 2007. – № 2. – С. 105–112.

*5. Кухаронак, Т. І.* Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 237 с.

6. *Можейко, З. Я.* Коляда в белорусском полесском селе / З. Я. Можейко // Совет. этнография. – 1969. – № 3. – С. 127–135.

7. *Стоянова, Ю. А.* Староукраїнська космогонічна колядка: семіотичний аналіз / Ю. А. Стоянова // Культура народов Причерноморья. – 2004. – № 47. – С. 74–78.

8. *Хамутова, І. В.* Лакальныя асаблівасці заходнепалескай каляднай абраднасці на прыкладзе давыдгарадоцкага абрадавага комплексу «Конікі» / І. В. Хамутова // Государства Центральной и Восточной Европы в исторической перспективе : сб. науч. ст. / М-во образования Респ. Беларусь [и др.] ; редкол.: В. И. Дунай [и др.] ; под ред. Р. Б. Гагуа. – Пинск, 2022. – Вып. 6. – С. 336–340.

9. *Хамутова, І. В.* Традыцыйны светапогляд і эстэтыка калядных песень палескай вёскі Хацісла / І. В. Хамутова // Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі : зб. навук. арт. / рэдкал.: В. П. Рагойша (старш.) [і інш.] ; пад навук. рэд. Т. А. Марозавай, С. В. Шамякінай. – Мінск, 2022. – Вып. 16. – С. 144–151.

10. *Хміль, І.* Українське Полісся : етнографічні нариси / І. Хміль= *Khmil, I.* Ukrainian Polissia : the ethnographical essays / I. Khmil. – Chicago : Society of the veterans of Ukrainian insurgent army in the U.S.A. and Canada, 1976. – 255 p.

УДК 781.4

***Н. Н. Ходинская,***
*кандидат искусствоведения, доцент,*
*доцент кафедры музыкально-теоретических дисциплин*
*учреждения образования «Белорусский государственный университет*
*культуры и искусств», г. Минск, Беларусь*

# НОВЫЕ ПОДХОДЫ К ПРЕПОДАВАНИЮ ГАРМОНИИ: УЧЕБНЫЕ ПОСОБИЯ XXI в.

**Аннотация.** Рассматриваются учебные пособия по курсу гармонии, созданные за два последних десятилетия, с целью выявления новых методов преподавания этой дисциплины. Отмечены творческий, фактурный, стилевой методические подходы, развивающие педагогические традиции, заложенные в пособиях XX в., а также подход, отражающий новые реалии времени, суть которого заключается в обобщении, схематизации теоретического материала, адаптации его для иностранных студентов.

**Ключевые слова:** гармония, учебные пособия, творческие задания, стилевой подход, схематизация, адаптация.